УДК 821.161.3'0.09:316.752

Эстэтычна-аксіялагічны патэнцыял помнікаў пісьменства ў трактоўцы аўтараў даўняй беларускай літаратуры

Бароўка В.Ю.
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск

У артыкуле даследуюцца крытэрыі ацэнкі вартасцей помнікаў пісьменства аўтарамі даўняй беларускай літаратуры.

Мэта работы – выявіць эстэтычна-аксіялагічныя крытэрыі ацэнкі помнікаў пісьменства аўтарамі даўняй беларускай літаратуры, прасачыць дынаміку функцыянавання эстэтычна-аксіялагічных крытэрыяў.

Матэрыял і метады. *Матэрыялам для даследавання сталі пісьмовыя помнікі XII–XVII стагоддзяў. Асноўныя метады – канкрэтна-гістарычны, тыпалагічны, дэскрыптыўны.*

Вынікі і іх абмеркаванне. *Аб'ектам асэнсавання аўтараў даўняй літаратуры былі антычная спадчына і кнігі Бібліі. У артыкуле вылучаюцца тыпалагічныя і канкрэтна-гістарычныя эстэтычна-аксіялагічныя крытэрыі ацэнкі твораў пісьменства аўтарамі перыяду Кіеўскай Русі, эпохі Адраджэння, XVII стагоддзя. Прасочваецца дынаміка функцыянавання эстэтычна-аксіялагічных крытэрыяў на кожным этапе развіцця пісьменства: у перыяд Кіеўскай Русі – праз аналіз "Жыція Еўфрасінні Полацкай", паслання Кліменція Смаляціча да прэсвітара Фамы, "слоў" Кірылы Тураўскага, "Слова аб палку Ігаравым"; у эпоху Адраджэння – праз характарыстыку культурнай спадчыны М. Гусоўскага і Ф. Скарыны, у XVII стагоддзі – праз даследаванне літаратурнай спадчыны Сімяона Полацкага.*

Заключэнне. *Крытэрыямі эстэтычнай значнасці твора ў перыяд Кіеўскай Русі выступалі адпаведнасць нормам хрысціянскай маралі, дыдактычнасць, занатаваная ў вобразнай тканіне; у перыяд Адраджэння важнымі крытэрыямі эстэтычнай значнасці становяцца грамадская каштоўнасць зместу, майстэрскае ўвасабленне пісьменніцкіх ідэй; у XVII стагоддзі – сэнсавая ёмістасць твораў, дасканаласць мастацкай формы.*

Ключавыя словы*: даўняя беларуская літаратура, аксіялогія, эстэтыка, антычная спадчына, Біблія, крытэрыі эстэтычнай значнасці, інтэрпрэтацыя.*

(Ученые записки. – 2017. – Том 23. – С. 145–149)

Esthetical-Axiological Potential of Literary Monuments in the Interpretation of Ancient Belarusian Literature Authors

Barouka V.Yu.
Educational Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University"

The article explores the features and criteria for assessing the monuments of writing by authors of ancient Belarusian literature.

The aim of the research is to reveal aesthetical-axiological criteria for evaluating monuments by the authors of ancient Belarusian literature, to trace the dynamics of functioning of these criteria.

Material and methods. *The material for the study was written monuments of the XII–XVII centuries. The basic methods of the research are the concrete-historical, the typological and the descriptive.*

Findings and their discussion. *The object of the authors' comprehension was the ancient heritage and the books of the Bible. Aesthetic-axiological criteria for evaluating literary monuments by the authors of Kievan Rus, the Renaissance and the 17th century are singled out. The dynamics of functioning of axiological and aesthetic criteria in the period of Kievan Rus is analyzed through the analysis of the "Life of E. Polotskaya", the letters of K. Smolatich to Thomas the Presbyter, works ("slovy") of K. Turovsky, "Slovo o Polku Igoreve"; during the Renaissance – through analyzing the cultural heritage of M. Gusovsky and F. Skoryna; in the 17th century – by analyzing the artistic heritage of S. Polotsky.*

Conclusion. *Criteria of the aesthetic significance of the literature work in the period Kievan Rus was compliance with the norms of Christian morality, didacticism; in the period of Renaissance – the social significance of content and writing skills, in the 17th century – the semantic fullness and perfection of the artistic form.*

Key words: *ancient Belarusian literature, axiology, aesthetic, ancient heritage, the Bible, criteria of aesthetic significance, interpretation.*

(Scientific notes. – 2017. – Vol. 23. – P. 145–149)

Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: dvkessibar@mail.ru – **В.Ю. Бароўка**

Даўняя беларуская літаратура характарызавалася выкананнем не толькі мастацкай, але найперш шырокіх пазамастацкіх функцый, пастаянным зваротам да Бібліі. У перыяд існавання даўняй літаратуры наглядалася фрагментарнае асэнсаванне ідэйна-мастацкіх вартасцей помнікаў пісьменства. Па меры секулярызацыі грамадства і пашырэння асветы паступова павялічвалася цікавасць да ролі і функцыянавання ў грамадстве пісьмовага слова. Аб'ектам ацэнкі і інтэрпрэтацыі найперш станавіліся тэксты Святога Пісьма і антычная спадчына.

Мэта дадзенай работы заключаецца ў выяўленні эстэтычна-аксіялагічных крытэрыяў ацэнкі помнікаў пісьменства аўтарамі даўняй беларускай літаратуры, у вызначэнні і характарыстыцы дынамікі функцыянавання эстэтычна-аксіялагічных крытэрыяў.

Матэрыял і метады. Матэрыялам для аналізу абраны творы XII–XVII стагоддзяў: "Жыціе Еўфрасінні Полацкай", пасланне Клімента Смаляціча да прэсвітара Фамы, "Слова пра паход Ігаравы", "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага, прадмовы і пасляслоўі Францыска Скарыны да кніг Бібліі, вершы Сімяона Полацкага. Асноўныя метады – канкрэтна-гістарычны, тыпалагічны, дэскрыптыўны.

Вынікі і іх абмеркаванне. Літаратура перыяду Кіеўскай Русі развівалася па сваіх законах, што вынікалі з гістарычных і сацыякультурных асаблівасцей часу. Важнай функцыяй пісьменства прызнавалася выхаваўчая: вербальны артэфакт абавязаны быў даваць прыклад паводзінаў сапраўднага хрысціяніна. Самымі рэпрэзентатыўнымі ў гэтых адносінах былі жанры "слова", прытчы, жыція. У гэтых помніках даўняга пісьменства мімаходзь згадвалася пра ролю кнігі і асветы ў жыцці чалавека і грамадства.

Да помнікаў пісьменства перыяду Кіеўскай Русі адносяцца "Жыціе Еўфрасінні Полацкай", "словы" Кірылы Тураўскага, "Слова аб палку Ігаравым". У "Жыціі Еўфрасінні Полацкай" ухвалялася захапленне юнай Прадславы кніжнай мудрасцю, што прывяло яе на шлях служэння Богу і людзям. Для Еўфрасінні ў часы манаства царкоўныя кнігі былі "ўцехай душы і ўзвесяленнем сэрца". Еўфрасіння, як адзначалася ў "Жыціі", "сэрца сваё паіла Божай мудрасцю". Святое Пісьмо атэставалася ўмацавальнікам і захавальнікам хрысціянскай веры. Славуты красамоўца Кірыла Тураўскі падкрэсліваў гаючую сілу слоў Святога Пісьма.

У перыяд Сярэднявечча адным з важных пытанняў было пытанне пра стаўленне хрысціяніна-чытача да язычніцкіх твораў, у прыватнасці да пісьмовых помнікаў антычнасці. "Апостальскія пастанаўленні" (III–IV ст.) раілі хрысціяніну пазбягаць язычніцкіх кніг, бо яны адштурхоўваюць чалавека ад праведнай веры. Афанасій Александрыйскі ў "Прамове супраць язычнікаў" крытыкаваў старажытнагрэчаскую міфалогію і паэзію за неналежны паказ багоў. Васілій Кесарыйскі ў 22 гаміліі "Пра тое, як юнакам мець карысць з язычніцкіх кніг" (377 г.) сцвярджаў, што асобныя помнікі антычнай літаратуры карысныя тым, што ў іх прысутнічаюць выказванні, якія адпавядаюць хрысціянскай этыцы. Галоўны крытэрый адбору язычніцкіх кніг, паводле Васілія Кесарыйскага, – карысць, якая вынікае ад знаёмства са станоўчымі характарамі і ўчынкамі ў творах, ад змешчаных у творах павучанняў. Найбольш карыснымі аўтарамі Васілій Кесарыйскі лічыў Гесіёда, Салона, Феягніда. Рэхам спрэчак пра месца і ролю антычнай пісьмовай спадчыны можна назваць палеміку Клімента Смаляціча (дата нараджэння невядомая – пасля 1164) з прэсвітарам Фамой. Яна паказальная стаўленнем нашых адукаваных продкаў да антычнай спадчыны. Фама абвінавачваў Клімента ў тым, што той, прагнучы вялікай вучонай славы, абапіраўся ў сваіх выказваннях не на айцоў царквы, а на Гамера, Платона, Арыстоцеля. У пасланні да прэсвітара Фамы Клімент Смаляціч даводзіў, што служка хрысціянскай царквы і ўвогуле адукаваны чалавек павінен мець шырокі кругагляд, што розум дазваляе чалавеку спасцігнуць Божую мудрасць і ісціну. Ён заўважаў, што духоўная асоба ў спрэчках адносна хрысціянскай веры не павінна спасылацца на язычніцкіх аўтараў, а ў прыватных размовах і ліставанні вольная на іх спасылацца. Апрача таго, Клімент Смаляціч лічыў, што не трэба літаральна разумець прадметнае значэнне біблейных тэкстаў, бо за прадметнымі абазначэннямі заўсёды праступае сутнасць. Іншымі словамі, неабходна іншасказальнае, трапалагічнае, анагагічнае прачытанне біблейных тэкстаў. Спецыфікай бытавання пісьмовых помнікаў у той час было тое, што асноўнай формай іх існавання былі зборнікі, а таму тэкст успрымаўся ў атачэнні іншых тэкстаў. Адукаваныя людзі маглі не чытаць многія пісьмовыя помнікі самі, але ведаць цытаты з іх, сабраныя ў зборніках. Напрыклад, у зборніку "Пчала" змяшчаліся "мудрыя

словы" розных гістарычных часоў. Чытацкая аўдыторыя таго часу не сумнявалася ў тым, што кніга дапамагае чалавеку выбраць правільны жыццёвы шлях. Царкоўныя кнігі ўспрымаліся як скарбніца вечных каштоўнасцей, што дадзены людзям Богам. У самой кнізе высока цаніўся яе павучальны змест.

"Слова аб палку Ігаравым" (канец XII стагоддзя – не пазней XIII стагоддзя) – помнік свецкай літаратуры, ён уключаў лаканічныя разважанні адносна манеры пісьма тагачасных аўтараў: "по былинам сего времени" або "по замышлению Бояню", які ў час аповеду пра падзеі "растекался мысию по древу", гэта значыць выказваўся квяціста, метафарычна. Аўтару "Слова" імпанаваў строгі стыль аповеду.

У эпоху Адраджэння наглядалася змена каштоўнасных этычных і эстэтычных прыярытэтаў, усталёўвалася антрапацэнтрычная канцэпцыя свету, прыўзносіліся вялікія магчымасці чалавека. Знакамітымі прадстаўнікамі эпохі Адраджэння былі Мікола Гусоўскі (1470–1533) і Францыск Скарына (каля 1490–1551). Таленавіты паэт-лацініст Мікола Гусоўскі ў звароце "Да найяснейшай уладаркі і пані Боны з ласкі Божай каралевы Польшчы, вялікай княгіні Літвы, Русі, Прусіі і інш. пані" выказваў спадзяванне, што Бона Сфорца нараіць свайму "яснавяльможнаму мужу, які абавязаны больш мець часу для вядзення войнаў, чым для чытання кніг", тых, каго яна палічыць больш таленавітымі. Мікола Гусоўскі смуткаваў, што "славуцейшыя сэрцы зусім не паважаюцца" ў дзяржаве. Ён асмеліўся папярэджваць каралеву пра небяспеку занядбання талентаў: "Яны з-за матэрыяльнай нястачы і беднасці цалкам не могуць сябе праявіць. Бачу я таксама, што ёсць нямала людзей, якія валодаюць і багаццем і талентам. Але калі яны заўважаюць, што вучоных, мастакоў і паэтаў так мала шануюць і паважаюць, то імкнуцца больш узбагачацца, чым ахарошваць душу" [1, с. 66]. Сваю заклапочанасць лёсам таленавітых людзей Мікола Гусоўскі тлумачыў дзяржаўнымі інтарэсамі: "Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела, пра што сведчаць як грэкі, так і рымляне. Іх магутнасць квітнела найбольш тады, калі расцвіталі навукі. А як толькі пачалі нікнуць таленты, сілы іх згаслі, а з заняпадам апошніх абрушылася іх дзяржава і ўсталявалася рабства" [1, с. 67]. У "Песні пра зубра" Гусоўскі выказаў уласныя меркаванні пра эстэтычныя вартасці твораў прыгожага пісьменства:

Я ж, не прыхільнік здагадак і розных фантазій,
Тое пяру давяраю, што сам не аднойчы
Бачыў, праверыў, зрабіў – свой мазолісты вопыт" [1, с. 80];
Я палічыў бы за грэх незнарок перамешваць
Ісціну з выдумкай байкі [1, с. 69].

Не без іроніі ацэньваў паэт-лацініст творы Плінія, у якіх над фактамі пераважала фантазія. Праўдзівасць і павучальнасць – важныя рысы сапраўднага мастацтва, таму Гусоўскі папярэджваў чытачоў, што яны ў яго творы не знойдуць "ні асалоды жыцця, ні вяселля, ні ласкі" [1, с. 80].

У паэме "Песня пра зубра" згадвалася гісторыя напісання паэмы, вызначаўся абавязак паэта адгукацца на падзеі часу, быць карысным роднай зямлі, таму Гусоўскі заклікаў пісьменнікаў-сучаснікаў:

Сумленне, і розум, і гонар
Ўладна загадваюць кніжніку: як са званіцы,
Бі ў сваё звонкае слова, узбройвай народы
Супраць разбою! Бясконца купае і губіць
Марс збраяносны людзей у крывавых купальнях [1, с. 99].

Выдатны дзеяч эпохі Адраджэння Францыск Скарына – перакладчык і інтэрпрэтатар Бібліі – свае погляды на ролю слова, на ролю Святога Пісьма выказваў найперш у прадмовах і пасляслоўях да кніг Бібліі. Мэта выдання Бібліі пазначалася ім наступным чынам: "Богу ко чти и людем посполитым к доброму научению". Біблія для Скарыны – асноўная крыніца ведаў, адукацыі і выхавання чалавека, плён Боганатхнёнага розуму і таленту, а таму Святое Пісьмо духоўна і цялесна выпраўляе чалавека. Знаёмства з кнігамі Святога Пісьма адкрывае чалавеку ісціны, што маюць катарсічнае і выхаваўчае ўздзеянне на чалавека. Ф. Скарына сцвярджаў, што кнігі Бібліі змяшчаюць знешні і ўнутраны сэнс. Знешні, або вонкавы, сэнс заключаецца ў тым, каб даць чалавеку магчымасць зразумець, "что есть потребно к духовному спасению его", унутраны сэнс зразумелы толькі прарокам, надзвычай абазнаным у навуках людзям. Яскрава гэта дэманструе жанр прытчы. У прадмове да "Прытчаў Саламонавых" гаварылася, што прытча дзякуючы іншасказальнаму характару і папулярызацыі "практычнай" жыццёвай мудрасці цікавая людзям розных маёмасных і ўзроставых станаў. Згодна з меркаваннямі беларускага першадрукара, у прытчы схавана мудрасць, як сіла ў каштоўным камяні, як золата ў зямлі, як ядро ў арэху. У прадмове да кнігі "Эклезіяст" Скарына ўда-

кладняў, што прытчы найперш разлічаны на маладых людзей, а "Эклезіяст" здольныя будуць зразумець толькі сталыя людзі. Францыск Скарына ацэньваў евангелістаў як пісьменнікаў, высока ставіў апавядальніцкае майстэрства Лукі. Як вядома, першай выдадзенай Скарынам у Празе кнігай быў "Псалтыр". Гэта адна з найбольш аўтарытэтных кніг Святога Пісьма. У прадмове да "Псалтыра" заўважалася: "Детем малым початок всякое доброе наукы, дорослым помножение в науке, мужем моцное утверждение". "Псалтыр" быў адной з самых запатрабаваных і распаўсюджаных кніг "Бібліі", бо псалмы спяваліся на царкоўных службах, іх добра ведалі вернікі, акрамя таго, псалмы былі паэтычнымі па форме, эмацыянальна ўздзейнічалі на слухачоў. "Псалтыр" таксама шырока выкарыстоўвалі ў навучальнай практыцы таго часу. Францыск Скарына лічыў вартасцю кнігі не толькі змест, але і форму, таму клапаціўся пра густоўнае афармленне сваіх выданняў кніг Бібліі.

Кніга ўспрымалася як сродак уздзеяння на чалавечую свядомасць, як носьбіт ісціны, як пабуджальная сіла для думкі і дзеяння ў часы актыўнай рэлігійнай палемікі, выкліканай прыняццем у 1596 годзе Брэсцкай уніі.

XVII стагоддзе – час, калі даўняя літаратура ўсё больш і больш набывала свецкія рысы. "Сармацкім Гарацыем" называлі Мацея Казіміра Сарбеўскага (1595–1640), які чытаў курсы паэтыкі ў езуіцкіх калегіях Полацка і Вільні. Сарбеўскі быў аўтарам трактата "Пра дасканалую паэзію, або Вергілій і Гамер". Паэтыка яго не была выдадзена, але мела распаўсюджанне сярод адукаваных людзей у спісах. У трактаце М. Сарбеўскага Бог названы Стваральнікам свету, Садаводам, Жывапісцам. Прыкметнай мастацкай з'явай XVII стагоддзя стала творчасць Сімяона Полацкага (1629–1680), дзякуючы якому літаратура, паводле Д.С. Ліхачова, "адваёўвае незалежнае месца ў культурным жыцці грамадства. Яна атрымлівае свабоду ад абраду, укладу, ад дзелавых функцый і тым самым становіцца вольнай выконваць сваю грамадскую функцыю не часткова, не ў сувязі з тым ці іншым прызначэннем жанру, а таксама непасрэдна, але непасрэдна па-мастацку і на больш свабодным ад дзелавых функцый узроўні" [2, с. 168]. Сімяон Полацкі – прыхільнік літаратуры еўрапейскага барока. Эстэтыка барока абапіралася на думку, што прыгожае мае Боскую прыроду. Сімяон Полацкі сцвярджаў, што літаратурная праца ўгодная Богу, што Бог залічыць яе маральнай заслугай чалавека ў вечным жыцці. У празаічнай прадмове да "Вертаграда шматкаляровага" (1680) Сімяон Полацкі прыўзносіў Бога-Творцу, надзяляў Яго ўласцівасцямі сейбіта, жывапісца, паэта, які стварыў свет "художественне и по благочинию" [3, с. 206]. Услед за заходнееўрапейскімі прадстаўнікамі барока ён праводзіў асацыятыўную паралель "паэт – другі Бог". "Псалтыр рыфматворны" (1680) Сімяона Полацкага стаў выяўленнем думкі пра тое, што Святое Пісьмо наскрозь прасякнута паэзіяй. Свой падыход да падачы псалмаў у выглядзе сілабічных вершаў Полацкі апраўдваў тым, што "Псалтыр" адпачаткова меў вершаваную форму. "Псалтыр рыфматворны" змяшчаў псалмы, "месяцаслоў" і дадатак, што заканчваўся вершам "Да гаждацеля" з тлумачэннем

Песни и молитвы в рифмех полагаем,
якже в заветех святых обретаем [цыт. па: 4, с. 175].

Сімяон Полацкі прытрымліваўся барочнай ідэі пісьменніцкай працы, у адпаведнасці з якой гэта маральны подзвіг асобы. Эстэтыка барока лічыла, што паэзія мае Боскае благаславенне, а слова Божае і слова як першаэлемент літаратуры тоесныя. Слова Божае трактавалася Полацкім з пазіцый барочнай дасціпнасці, а гэта патрабавала сумяшчаць несумяшчальнае: старазапаветны і евангельскі логас і першаэлемент літаратуры як слоўнага мастацтва. На падставе тэкстаў Бібліі сцвярджалася, што слова як атрыбут Бога мае вялікую сілу. Сімяон Полацкі выкарыстоўваў антычныя і біблейскія сюжэты. У вершы "Кніга" ён прыгадаў пакаранне Ераніму Бажавільнаму (330–419) за чытанне антычных аўтараў і іранічна падсумаваў:

Лучше убо, братие, святым прилежати,
а ины книги, разве с потребы читати [3, с. 366].

У топіцы раннехрысціянскіх і сярэднявечных аўтараў шырока вядомы выраз "свет ёсць кніга", дзе сусвет рэпрэзентаваны як рэалізацыя слова Божага ў часе і прасторы.

Мир сей приукрашенный – книга есть велика,
еже словом написа всяческих Владыка [3, с. 366] – гэта цытата з верша Сімяона Полацкага са зборніка "Вертаград шматкаляровы", дзе звяртае на сябе ўвагу энтымема сілагізму. Поўны сілагізм наступны: Бог ёсць стваральнік кнігі, свет ёсць кніга, значыць, Бог – стваральнік кнігі.

Як паэтычнае сцвярджэнне гэты выраз метафарычны. Чалавек як мікракосмас паэтам атаясамліваецца з сусветам: галава чалавека – неба, сэрца – агонь, лёгкія – паветра, печань – вада, косці і мышцы – зямля. У вершы "Кніга" прысутнічае рух ад агульнага да прыватнага і ад прыватнага да агульнага. Полацкі раскладае кнігу на часткі – лісты, словы, літары-"пісьмёны", глядзіць на кожную з іх, гэта значыць чытае кнігу, пераконваецца ў прыгажосці кожнай з частак і заканчвае твор ухваленнем Стваральніка кнігі – Бога. Далей у вершы "Кніга" працягвалася атаясамліванне супастаўляльных частак:

Различны книги нам суть Богом предложенны,
да богонравно жити будем наученны [3, с. 366–367].

Першая кніга – свет, другая – Стары Запавет, або "пісаны закон", трэцяя – Хрыстос, чацвёртая – Багародзіца, пятая – сумленне. Іншымі словамі, людскія ўчынкі – пісьмёны, якія чалавек заносіць у кнігу свайго сумлення. Слова Божае – сродак сувязі, калі імкненні гаворачага добрыя – яно дае пазітыўны вынік, калі дрэнныя – то дрэнны вынік, што даводзіць да граху і расплаты за грэх. Топас "свет ёсць кніга" сваімі каранямі ўзыходзіць да Бібліі. У кнізе прарока Ісаі неба, што схавалася ад чалавечага зроку, параўноўваецца са світкам як старажытнай формай кнігі. Асацыяцыі, звязаныя з кнігай, прывялі Сімяона Полацкага да высновы, што паэт падобны да Стваральніка.

Верш "Гутарка" – апалогія кніжнай мудрасці, кнігі – справа, якая служыць Богу нароўні з малітвай:

Хотяй с Богом беседу присну держати,
да молится и книги да тщится читати,
Ибо, когда молимся, и глагол наш есть Богу,
егда чтем, Господь творит к нам беседу многу.
Блага убо перемена сих делес бывает,
егда кто и молится, и книги читает [3, с. 329].

Сімяон Полацкі звярнуўся і да топасу "з'ядання кнігі", як сведчаць назвы яго зборнікаў "Абед духоўны" (1681), "Вячэра духоўная" (1683). У вершы "Пісанне" ён расказваў пра функцыі слова і пісьменства: гістарычную функцыю (значэнне), алегарычную, трапалагічную (індывідуальна-дыдактычную), анагагічную (эсхаталагічную). Сімяон Полацкі ўспрымаў помнік пісьменства як крыніцу ведаў, таму як паэт-энцыклапедыст імкнуўся даць чытачам звесткі з розных галін навукі. Паэт, у разуменні Полацкага, – стваральнік, абавязаны дэманстраваць сваё майстэрства і ў арганізацыі паэтычнага твора. Сам ён ужываў формы ўскладненых метафар, алегорый, сімвалаў, адмысловае размяшчэнне вершаваных радкоў (у форме крыжа, круга).

У вершы "Пісанне" давалася ідэальная характарыстыка барочнага літаратара XVII стагоддзя, рэпрэзентаваліся абліччы дасканалай пісьменніцкай асобы. Сапраўднага паэта Сімяон лічыў шчаслівым чалавекам, гаспадаром ісціны, майстрам. Помнік пісьменства, згодна з меркаваннямі Полацкага, павінен даваць веды, асалоду, абуджаць эмоцыі, развіваць мысленне, выхоўваць чалавека.

Заключэнне. Эстэтычна-аксіялагічны патэнцыял пісьмовых помнікаў аўтарамі даўняй літаратуры ацэньваўся на падставе крытэрыяў, дэтэрмінаваных "гістарычным бессвядомым" (М. Фуко), сфарміраваных гістарычным часам, сацыякультурнымі абставінамі, разуменнем літаратуры.

Аб'ектам асэнсавання выступалі не сучасныя творы, а помнікі антычнага пісьменства, якія разглядаліся з пункту гледжання сэнсавага напаўнення і адпаведнасці нормам хрысціянскай маралі, а таксама кнігі Бібліі.

Пісьменства ўспрымалася як крыніца ведаў і сродак умацавання хрысціянскай веры, выхавання чалавека. Крытэрыямі прыгажосці, эстэтычнай значнасці пісьмовага помніка на пачатковай стадыі развіцця даўняй беларускай літаратуры выступалі яго адпаведнасць нормам хрысціянскай маралі, дыдактычнасць, занатаваная ў вобразнай тканіне; у перыяд Адраджэння важнымі крытэрыямі эстэтычнай значнасці становяцца грамадская каштоўнасць зместу, майстэрскае ўвасабленне пісьменніцкіх ідэй; у XVII стагоддзі – сэнсавая ёмістасць твораў, дасканаласць мастацкай формы.

Літаратура

1. Слова пра паход Ігаравы: паэма. Гусоўскі, М. Песня пра зубра: паэма. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 188 с.
2. Лихачев, Д.С. О филологии / Д.С. Лихачев. – М.: Высш. шк., 1989. – 208 с.
3. Полоцкий Симеон. Вирши / Симеон Полоцкий. – Минск: Маст. літ., 1990. – 447 с.
4. Панченко, А.М. Русская стихотворная культура XVII века / А.М. Панченко. – Л.: Наука, 1973. – 280 с.

Паступіў у рэдакцыю 02.05.2017 г.